*А. Ю. Казленка*

# САЦЫЯЛЬНА-ПЕДАГАГІЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ БІЯБІБЛІЯГРАФІЧНАЙ ІНФАРМАЦЫІ Ў ПРАЦЭСЕ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ ГРАМАДСТВА

Працэсы глабалізацыі ахапілі эканамічную, палітычную і культурную сферы грамадскага жыцця. Глабалізацыя з’яўляецца аб’ектыўным працэсам, які дае прынцыпова іншы набор цывілізацыйных каштоўнасцей і прыярытэтаў. У дакладзе Рымскага клуба адзначаецца, што глабальная рэвалюцыя не мае ідэалагічнай асновы, яна фарміруецца пад уздзеяннем геастратэгічных, сацыяльна-тэхналагічных, культурных і этычных фактараў, спалучэнне якіх вядзе ў невядомасць [2].

Глабалізацыя, якая сёння праяўляецца ў мностве стыхійных і слабакіруемых працэсаў сусветнай сацыякультурнай сістэмы, нараўне з відавочнымі дасягненнямі і пазітыўна асэнсаваным патэнцыялам вылучае і шэраг праблем. Так, паступова губляецца нацыянальная самаідэнтыфікацыя, развіваюцца працэсы дэперсаналізацыі асобы, самакаштоўнасць асобы перастае быць прыярытэтам.

Узнікае пытанне, у якіх суадносінах знаходзяцца сацыяльна-педагагічны патэнцыял біябібліяграфічнай інфармацыі з глабальнымі тэндэнцыямі?

Можна сцвярждаць, што біябібліяграфічная інфармацыя як від бібліяграфічнай інфармацыі, які мае сваім аб’ектам інтэлектуальную і мастацка-творчую спадчыну персаналій і калектываў, садзейнічае чалавечай самарэалізацыі і ідэнтыфікацыі ў шырокім сэнсе і дазваляе нацыянальнай грамадзе адначасова як інтэгравацца ў сусветную навуковую і мастацка-творчую супольнасць, так і акрэсліць межы і значнасць свайго ўкладу.

Біябібліяграфічная інфармацыя дазваляе зарыентаваць карыстальніка ў гісторыі навук, культуры і даць асноўныя звесткі аб вядучых іх прадстаўніках. Жыццяпіс у выданнях біябібліяграфічнай інфармацыі будуецца на аснове сінтэзу прыёмаў вобразнага адлюстравання асобы і калектыву з элементамі бібліяграфічнай характарыстыкі іх творчасці. Абагульняючы вынікі дзейнасці асобных персаналій і калектываў, фарміруючы нябачны калектыў вызначанага профілю, біябібліяграфічная інфармацыя прама або ўскосна, з аднаго боку, персаніфікуе дасягненні ў

разнастайных напрамках грамадскага жыцця, навукі і культуры і, з другога боку, удзельнічае ў апісанні сукупнага працэсу культурна-гістарычнага развіцця дзяржавы і сусвету.

Праз біяграфію і бібліяграфію біябібліяграфічная інфармацыя далучае карыстальніка да кола каштоўнасцей мінулага і сучаснага, фарміруе на гуманістычнай аснове культуру чалавека, выхоўвае самастойнае мысленне.

Прыярытэт выданняў аб персаналіях і калектывах у сістэме патрэбнасці навукі адзначаўся заўсёды. Біябібліяграфічная інфармацыя забяспечвае ўсебаковае і аб’ектыўнае даследаванне жыцця і творчасці персаналій і калектываў навукі, культуры, адукацыі, значна палягчае стварэнне твораў біяграфічных жанраў, а таксама аказвае істотную дапамогу ў развіцці гісторыі навукі і практыкі. Акрамя таго, як вынік вузкіх спецыялізацый прадстаўнікоў навукі і культуры, чыя інтэлектуальная творчасць адлюстравана ў біябібліяграфічных матэрыялах, біябібліяграфічная інфармацыя часта замяняе тэматычную і забяспечвае спецыялістаў актуальнай бібліяграфічнай і фактаграфічнай інфармацыяй па маларaспрацаваных тэмах, запаўняючы лакуны ў інфармацыйных сістэмах.

У Рэспубліцы Беларусь большая частка самастойных біябібліяграфічных паказальнікаў – навукова-дапаможныя, сацыяльна-педагагічны патэнцыял у якіх выражаны не яскрава. Аднак ускосна, праз структуру, праз выбар методыкі адбору навукова-дапаможныя біябібліяграфічныя паказальнікі таксама выхоўваюць у чалавека гонар за Радзіму, за беларуса, за простага чалавека. Яны накіроўваюць чалавека на дасягненні, падобныя дасягненням таго беларуса, якому прысвечаны не толькі артыкул у энцыклапедыі, але і самастойнае біябібліяграфічнае выданне.

Крыніцы біябібліяграфічнай інфармацыі прызначаны садзейнічаць павышэнню ўзроўню культуры карыстальнікаў у шырокім сэнсе: культуры духоўнай, палітычнай і эканамічнай, экалагічнай, мастацкай, культуры зносін і культуры чытання. Яны накіраваны на распаўсюджанне ведаў, фарміраванне асобы сучаснага чалавека, здатнага на аснове духоўных багаццяў, якія накоплены чалавецтвам і выдатнымі прадстаўнікамі яго Радзімы, выпрацаваць сваю жыццёвую пазіцыю.

Рост разнастайнасці біябібліяграфічнай інфармацыі азначае пашырэнне магчымасцей індывідуальнага выбару, задавальненне інтэлектуальных і культурных запытаў розных груп насельніцтва, спрыяе пераадоленню культурнай нацыянальнай замкнёнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калі ў мінулыя стагоддзі дзяржавы і імперыі аслабляліся і сыходзілі з гістарычнай сцэны ў выніку войн, канфліктаў эліт, нікчэмнага дзяржаўнага кіравання, то ў недалёкім будучым гэта можна будзе рабіць з дапамогай кіравання адтокам кадравага патэнцыялу грамадства. Не толькі ўсведамленне гэтай сітуацыі, але і распрацоўка адэкватных мер з'яўляюцца ўмовамі захавання інтэлектуальнага і мастацка-творчага патэнцыялу Рэспублікі Беларусь. Сярод асноўных мер неабходна таксама вылучыць аператыўнае і якаснае адлюстраванне дасягненняў персаналій і калектываў, што, па-першае, будзе з'яўляцца сведчаннем цэннасці персаналіі, калектыву для дзяржавы і грамадства і, па-другое, дадатковай крыніцай шырокага распаўсюджання набытых ведаў.

Арыентацыя на пашырэнне інтэлектуальнага патэнцыялу чалавека, мабілізацыю яго мыслення, развіццё яго пазнавальных здольнасцей, творчага патэнцыялу, крэатыўнасці, разнастайных праяў духоўнасці, маральнага здароўя з'яўляецца агульнай мэтай арганізацыі функцыянавання ў прасторы біябібліяграфічнай інфармацыі. Разуменне гэтай мэты дае выклік дзейнасці супрацоўнікам бібліятэк па падрыхтоўцы бібліяграфічных рэсурсаў аб персаналіях і калектывах розных сфер дзейнасці.

Як прыярытэтныя ў арганізацыі функцыянавання біябібліяграфічнай інфармацыі Рэспублікі Беларусь можна вылучыць наступныя кірункі: выкарыстанне найноўшых інфармацыйных тэхналогій пры стварэнні біябібліяграфічнай інфармацыі; акцэнт на падрыхтоўку электроннай біябібліяграфічнай інфармацыі, якая дазваляе прадстаўляць і паўнатэкставую, аўдыяльную, графічную і мультымедыйную інфармацыю; шырокая рэклама ствараемых бібліятэкамі біябібліяграфічных прадуктаў; распрацоўка метадычных рэкамендацый па стварэнні бібліятэкамі біябібліяграфічнай інфармацыі з улікам сучасных тэндэнцый у падрыхтоўцы інфармацыі аб асобе і калектыве; улік канкурэнтаздольнасці ствараемых біябібліяграфічных прадуктаў.

Адраджэнне і зберажэнне нацыянальнай памяці, выхаванне маладога пакалення – найбольш важныя задачы, якія стаяць перад дзеячамі сучаснай айчыннай культуры. Вучоныя, краяведы, даследчыкі, бібліёграфы і ўсе тыя, хто ганарыцца гісторыка-культурнай і навуковай спадчынай сваёй краіны, паступова прыходзяць да асэнсавання неабходнасці вывучэння жыцця і дзейнасці персаналій і калектываў розных сфер дзейнасці; стварэння біябібліяграфічных манаграфій аб іх, а таксама

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шматперсанальных дапаможнікаў. Вядома, што кульмінацыяй прызнання значнасці дзейнасці чалавека перад нацыяй і сусветным згуртаваннем служыць з'яўленне асобнага напрамку навуковай дзейнасці: напрыклад, Пушкініяны ў Расіі, Скарыніяны ў Рэспубліцы Беларусь. Без біябібліяграфічнага забеспячэння паспяховае развіццё гэтага кірунку марудзіцца. Наяўнасць біябібліяграфічнай інфармацыі, разуменне яе функцыянальнага патэнцыялу, эфектыўнае шматаспектнае яе выкарыстанне з мэтай генерацыі і распаўсюджання комплекснай інфармацыі аб персаналіі і калектыве як суб'екце і аб'екце культуры, выхавання сапраўдных грамадзян сваёй краіны – выразны барометр адносін грамадства да дасягненняў чалавека і дзяржавы.

1. *Карпичев, В. С.* Социальное управление в контексте социосинергетического знания / В. С. Карпичев // Глобализация: синергетический подход / под ред. В. К. Егорова. – М.: Изд-во РАГС, 2002. – С. 229–232.

2. *Кинг, А.* Первая глобальная революция: докл. Рим. клуба / А. Кинг, Б. Шнайдер; пер. с англ. Д. Саприки [и др.]; вступ. ст. и ред. Д. М. Гвишиани; Сов. ассоц. содействия Рим. клубу. – М.: Прогресс, 1991. – 339 с.

3. *Турчинов, А. И.* Глобализация и проблемы интеллектуальных ресурсов общества / А. И. Турчинов // Глобализация: синергетический подход / под ред. В. К. Егорова. – М.: Изд-во РАГС, 2002. – С. 151–253.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ